*Уладзімір Аўсейчык*

**ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ АБРАДНАСЦІ СТАРАВЕРАЎ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ**

*У артыкуле разгледжана гісторыя вывучэння субкультуры старавераў Паўночнай Беларусі. Дадзена характарыстыка працам, якія змяшчаюць інфармацыю аб традыцыйных сямейных і каляндарных абрадах, у выніку чаго аўтар сцвярджае, што дадзеная праблематыка дагэтуль не знайшла належнага адлюстравання ў навуковай літаратуры.*

*Vladimir Avseychik*

**HISTORY OF STUDIES OF THE TRADITIONAL REMEDIES OF THE NORTH BELARUS STAROVERS**

*The article deals with the history of studying the traditional ritualism of Old Believers of Northern Belarus. The characterization of those works which contain information about traditional family and calendar rites is given. We come to the conclusion that until our time this problem has not been properly reflected in scientific literature.*

Традыцыйная абраднасць старавераў Паўночнай Беларусі доўгі час не з’яўлялася аб’ектам вывучэння. Таму напрамак дадзенага артыкула, падрыхтаванага ў ходзе працы па тэме «Фольклорное осмысление и интерпретация истории в традиционной культуре белорусов Подвинья конца XIX – начала XXI вв.», якая выконваецца ў рамках задання 1.2.06 «Фольклорное наследие белорусов в современном славянском мире: параллели, генезис, локальные особенности» (2016–2020; № 20160589) з’яўляецца актуальным і перспектыўным. Бадай першай працай, дзе бала апублікавана інфармацыя па традыцыйнай абраднасці стараверац на паўночнабеларускіх землях стаў нарыс А. Вішнякова «Раскол у заходне-рускім краі». Ён быў надрукаваны ў 1865 г. у «Весніку Заходняй Расіі» (пад псеўданімам А. Вескінскі) [2]. Праца змяшчае апісанне шлюбных традыцый стараверац-беспапоўцаў Віцебшчыны. У працы В. Волкова «Звесткі пра пачатак, распаўсюджанне і раздзяленне расколу і аб расколе ў Віцебскай губерні» (1866) [4] таксама прыводзіцца апісанне вясельных абрадаў стараверац, а таксама звернута ўвага на тэндэнцыі да разбурэння традыцыйнага ўклада і шлюбных традыцый.

Шэраг матэрыялаў па сямейнай абраднасці стараверац Падзвіння быў апублікаваны ў абагульняючых даследаваннях канца XIX – пачатку XX ст. Так, матэрыялы па традыцыйнай вясельнай абраднасці стараабраднікаў Беларускага Падзвіння былі апублікаваны ў кнізе «Віцебская губерня: гістарычна-геаграфічны і статыстычны агляд» (1890) [3]. У выданні змешчана апісанне этапу выбару нявесты, а таксама ўрачыстасці заключэння шлюба. У кнізе «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны. IX том. Верхняе Падняпроўе і Беларусь» (1905) [13] таксама дадзена кароткая характарыстыка сямейных адносін і вясельных традыцый стараверац Віцебшчыны. Аднак большая частка даных не вылучаецца навізной і прыведзена з вышэй згаданага выдання «Віцебская губерня: гістарычна-геаграфічны і статыстычны агляд». Інфармацыя па вясельнай абраднасці і святах стараверац заходняга Падзвіння ўтрымліваецца таксама ў кнізе Г. Посаха «Відзы» (1895) [12].

У міжваенны перыяд актыўнае этнаграфічнае даследаванне тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая па Рыжскай мірнай дамове адыйшла ў склад Польшчы, вяліся польскімі даследчыкамі. Сярод выданняў, што змяшчаюць матэрыялы па старaверстве ў Заходняй Беларусі, каштоўнасць уяўляе праца О. Хедэмана «Гісторыя Браслаўскага павета» [17]. У працы звернута ўвага на істотныя змены ў побыце стараверац і іх рэлігійнасці ў другой палове XIX ст., разгледжаны працэсы эвалюцыі абрадавай культуры.

У пасляваенны перыяд у беларускай гістарыяграфіі не было спецыяльных даследаванняў, прысвечаных стараверскаму насельніцтву. Пры гэтым шэраг аспектаў дадзенай праблематыкі былі разгледжаны ў сувязі з іншымі даследаваннямі. Так, некаторыя асаблівасці вясельнай абраднасці стараверац Віцебшчыны М. Нікольскі ахарактарызаваў у працы «Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці» (1956) [9]. У той жа час у 1950-1980-х гг. быў апублікаваны шэраг прац па гісторыі і культуры стараверац на літоўскіх і латвійскіх землях. Некаторыя з гэтых даследаванняў закранаді і стараверац Паўночнай Беларусі. Сярод прац па староверах Латвіі асабліва вылучаюцца даследаванні А. Заварынай. У 1956 г. яна абараніла дысертацыю на тэму «Сям’я і сямейны побыт рускага старажыльчаскага насельніцтва Латгаліі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст.».

Пачынаючы з 1990-х гг. даследаванні гісторыі і культуры стараверства на беларускіх землях павялічыліся. Істотная роля ў вывучэнні стараверства ў Беларусі належыць А. Гарбацкаму. У шэрагу прац [5-7] даследчык разглядаў асаблівасці сямейнай і каляндарнай абраднасці стараверац. У манаграфіі «Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.» (1999) [5] разгледжаны асаблівасці вясельнай абраднасці стараверац Беларусі, у т.л. і на Віцебшчыне. Другая манаграфія А. Гарбацкага «Стараабрадніцтва на беларускіх землях» (2004) [7] утрымлівае апісанне каляндарных абрадаў стараверац Браслаўскага і Шаркаўшчынскага раёнаў. У сумесным артыкуле з Т. Дабжынскай ім разгледжана пахавальная абраднасць стараверац Віцебшчыны [6].

У 2000-я гг. вывучэнне традыцыйнай культуры стараверац на беларускіх землях некалькі актывізавалася. Быў апублікаваны шэраг даследаванняў, прысвечаных каляндарнай і сямейнай абраднасці стараабраднікаў. На аснове этнаграфічных матэрыялаў апошняй чвэрці XIX ст. У.С. Філіпенка прааналізаваў вясельную абраднасць стараверац-беспапоўцаў Паўночнай Беларусі [16]. Шэраг работ традыцыйнай духоўнай культуры стараверац Віцебшчыны прысвяціла Т. Трафімава (Дабжынская) [6; 14-15]. Яе працы ў асноўным прысвечаны староверам заходняга Падзвіння і храналагічна абмежаваны канцом XIX – пачаткам XX ст. Але аўтарам выкарыстаны і матэрыялы больш позняга перыяду. Паколькі ў артыкулах шырока прадстаўлены матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў (у асноўным, успаміны рэспандэнтаў 1920-1930-х гг. нараджэння), то гаворка часта вядзецца і пра ўсю першую палову XX ст. Некаторыя асаблівасці веснавой каляндарнай абраднасці стараверац заходняга Падзвіння разгледзела І. Алексніна [1].

Асобныя аспекты традыцыйнай абраднасці стараверац Беларусі разгледжаны ў навукова-папулярным выданні «Хто жыве ў Беларусі» (2012) [8]. У раздзеле «Рускія», аўтарам якога з’яўляецца Г. Каспяровіч, ахарактарызаваны традыцыйныя сямейныя абрады, выўялены некаторыя змены ў абраднасці ў XX – пачатку XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ(?)

Важную ролю ў даследаванні традыцыйнай абраднасці старавераў Паўночнай Беларусі адыграў літоўскі вучоны Ю. Новікаў. Шэраг артыкулаў ён прысвяціў аналізу каляндарных традыцый старавераў памежных беларуска-літоўскіх тэрыторый [10–11].

Такім чынам, даследаванне традыцыйнай культуры старавераў Паўночнай Беларусі мае даўнюю традыцыю. Першыя працы былі апублікаваны яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Нягледзячы на гэта, асаблівасці традыцыйнай абраднасці старавераў вельмі рэдка станавіліся аб'ектам увагі даследчыкаў. Да нашага часу дадзеная праблематыка не знайшла належнага адлюстравання ў навуковай літаратуры.

**Спіс літаратуры:**


1. Алексніна, І. Да пытання аб святкаванні веснавых святаў на тэрыторыі Заходняга Паазер'я / І. Алексніна // Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання: бюлетэнь VII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 крас. 2013 г. / БДУКМ; рэдкал. : В. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 94–96.
2. Вескинский, А. Раскол в западно-русском крае / А. Вескинский // Вестник Западной России. Историко-литературный журнал, издаваемый К. Говорским. – Вильна : Тип. А. Сыркина, 1865 (май). – Том III. – С. 286–303.
3. Витебская губерния: историко-географический и статистический обзор. Вып. 1. История. Природа. Население. Просвещение / сост. по программе и под ред. В. Долгорукова. – Витебск : Губ. тип., 1890. – [2], 387 с., [18] л.
4. Волков, В. Сведения о начале, распространении и разделении раскола и о расколе в Витебской губернии / В. Волков. – Витебск : Тип. Губернского правления, 1866. – 21 + 85 с.
5. Гарбацкі, А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.ст. / А. Гарбацкі – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.
6. Горбацкий, А. Семейные похоронные обряды старообрядцев Витебщины в конце XIX – первой половине XX вв. (по материалам историко-этнографических экспедиций) / А. Горбацкий, Т. Добжинская // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2005. – №1. – С. 52–54.
7. Горбацкий, А. Старообрядчество на белорусских землях / А. Горбацкий. – Брест : БрГУ, 2004. – 305 с.
8. Кто живет в Беларуси / А. Гурко [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 799 с.
9. Никольский, Н. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. Никольский. – Минск : Издательство АН БССР, 1956. – 275 с.
10. Новиков, Ю. Пасхальный обход дворов у старообрядцев белорусско-литовского пограничья / Ю. Новиков // Kalbotyra : Slavistica Vilnensis. – 2002. – №. 51. – P. 81–92.
11. Новиков, Ю. Фольклор старообрядцев стран Балтии (истоки, динамика развития, особенности бытования) / Ю. Новиков // Kalbotyra : Slavistica Vilnensis. – 2009. – Т. 54. – Р. 140–155.
12. Посох, Г. Видзы / Г. Посох. – Ковно : Тип. губ. правл., 1895. – 13 с.
13. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. – СПб. : Изд. А. Девриена, 1905. – Т.9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия / сост. В. Семенов, М. Довнар-Запольский, Д. Шендрик [и др.]. – VIII. – 620 с.
14. Трофимова, Т. Духовная культура старообрядцев Витебщины в конце XIX – начале XX века / Т. Трофимова // Православие в духовной жизни Беларуси: сборник трудов III Межд. научно-практич. конференции, посвященной 1025-летию Крещения Руси, Брест, 24–25.10.2013 / под общей редакцией А. Горбацкого. – Брест, 2015. – С. 155–164.
15. Трофимова, Т. Семейные обряды старообрядцев Витебщины в конце XIX – первой половине XX века / Т. Трофимова // Рэлігія на памежжы : еўрарэгіён «Буг»: зб. навук. прац / УА «БрДУ». – Брэст, 2008. – С. 81–89.
16. Філіпенка, У. Вясельная абраднасць старавераў-беспапоўцаў Беларусі (па этнаграфічных матэрыялах апошняй чвэрці XIX стагоддзя) / У. Філіпенка // Старообрядчество как историко-культурный феномен / Материалы международной научно-практической конференции. – Гомель : ГГУ, 2003. – С. 283–288.
17. Hedeman, O. Historja powiatu Brasławskiego / O. Hedeman. – Wilno : Polska Druk. Nakładowa «Lux», 1930. – 434 s.



***Алла Никифоренко***


**ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ ОСОБЕННОСТИ ТИБЕТСКОГО КУЛЬТОВО-РИТУАЛЬНОГО ТАНЦА «ЦЯМ»**


***Alla Nikiforenko***


**ARTISTIC FEATURES OF THE TIBETAN CULTURAL-RITUAL DANCE «TSAM»**


*Автор статьи рассматривает характерные особенности тибетского танца «Цям». Данный танец представляет собой культово-ритуальную мистерию, содержание которой базируется на почитании ценностей буддизма. Этот хореографический спектакль имеет четкую структуру и строгие правила исполнения.*

*The author examines the characteristics of Tibetan dance «Cham». It is a specific religious-ritual mystery, the content of which is based on the worship of Buddhism. This dance performance has a clear structure and stringent rules of performance.*


«Цям» – это самый важный храмовый танец тибетцев, который по своему художественному выражению скорее напоминает культово-ритуальное действо, или мистерию. В дословном переводе с тибетского («чхам», cham, или «цам») означает «танец» или, точнее, «танец богов» [3] Происхождение танца и его распространение тесно связаны с историей зарождения и развития ламаизма. *Ламаизм* – это позднее и наиболее целостное направление в буддизме, которое развивалось на территории Тибета и прилегающих к нему регионов – территория Гималаев, восточные регионы Центральной Азии. По представлениям ламаистов, учение Будды охраняют «гневные тибетские духи».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ